# ТРАДЫЦЫЙНЫЯ СТРОІ БЕЛАРУСІ

*Беларускае адзенне*
*канца XIX – пачатку XX стагоддзяў па рэгіёнах*

**Воля Дземка**

**Кантакт:** Воля Дземка, аўтар
volyagroup.nonprofit@gmail.com
Тэлефон: (+1) 206-659-7811

**Убачыць, закахацца і ганарыцца**

Выйшаў у свет новы альбом «Традыцыйныя строі Беларусі»

Па-першае, гэта прыгожа. Альбом «Традыцыйныя строі Беларусі», у якім прадстаўлена беларускае адзенне канца XIX—пачатку XX стагоддзя па рэгіёнах, нагадвае букет жывых кветак — пяшчотных і святочных, як вэлюм нявесты, цёплых і ўтульных, як вышываныя ручнікі ў вясковай хаце бабулі і дзеда.

Па-другое, гэта сапраўдна і спрадвечна. Тут няма сучасных фантазій паводле рэгіянальных строяў. Усе камплекты, якія знаходзяцца ў калекцыі амерыканскай беларускі Волі Дземкі і фальклорнага гурта VOLYA з Сіэтла — тыя самыя традыцыйныя строі, з любоўю сабраныя з розных крыніц, ад беларускіх вёсачак да міжнародных аўкцыёнаў, і адрэстаўраваныя рукамі майстрых.

На сёння ў калекцыі 32 поўныя камплекты жаночага і 3 камплекты мужчынскага адзення з 234 прадметаў і аксесуараў, што датуюцца 1880—1940-мі гадамі. Усе строі ў каталогу — не паўсядзённыя, святочныя, іх надзявалі з асаблівых выпадкаў.

Па-трэцяе і галоўнае, гэта своечасова. Здавалася б, ці варта весці гаворку пра строі, калі ідзе вайна і адзін суседскі народ агрэсіўна і бязлітасна руйнуе жыццё другога?.. Варта і трэба. Каб больш не падманвацца дэмагогіяй пра «братэрства», а ўзгадаць пра самасць, пра нацыянальную ідэнтычнасць. Пра тое, што беларусы — нацыя, а не жыхары Паўночна-Заходняга краю імперыі, што наша мова — не дыялект, а народныя строі — не варыяцыі рускіх сарафанаў ды касаваротак, а тканы і вышываны летапіс жыцця нашых продкаў.

Цікавая дэталь: дыван, які стаў фонам для ўсіх мадэляў і строяў у каталогу, — таксама частка нашай агульнай гісторыі і культуры, гэта аўтэнтычная беларуская маляванка з Паазер'я. Зрэшты, абсалютна кожная рэч тут мае сваю гісторыю, ад пацерак і карункаў да пасаў і галаўных убораў.

Да прыкладу, каб рэканструяваць галаўны ўбор тураўскага строю, «галовачку», спатрэбіліся не толькі адпаведныя ніткі і тканіна, а шэраг навуковых кансультацый з супрацоўніцай Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Марыяй Віннікавай — яна даследавала гэты ўбор у Кунсткамеры ў Санкт-Пецярбургу.

«Гэтыя строі — яны незвычайныя. У іх можна разгледзець прыгажосць і годнасць Беларусі, якія захоўваюцца стагоддзямі, нягледзячы на бясконцы шэраг трагічных падзеяў, праз якія ідзе наша краіна, — тлумачыць Воля Дземка. — І зробленыя яны маглі быць толькі ў Беларусі. Яны літаральна выйшлі з гэтай зямлі: спачатку тут вырасла ільняное насенне, а потым беларускія жанчыны сабралі лён, сткалі тканіну і пашылі адзенне...».

**Сайт праекта:** VOLYA.weebly.com/costumes